## “Перад кім здымаю шляпку”



Чым далей ідзеш у лес –
Тым крапчае інтарэс.
Вокам кінь сюды-туды –
Як грыбы растуць... грыбы.
На гуртку ўзялі газету –
І зляпілі шапку гэту,
Следам ножку фармавалі,
Колер шакаладу бралі…
Што стварылі, вы пазналі?
Так, з рук выйшаў баравік
І да выстаўкі прыліп.
Грыб расце, як на драждждах,
Набірае грамы – ах!
Ён за суткі, як дазнацца,
Набірае грамаў дваццаць.
Добры грыб, што ні кажы.
У супе – смаку віражы!



## Пушчавік



А напрыканцы пара
Нам уважыць спадара
Белавежскага багацця –
Гэта Пушчавік, мой браце!
Нарадзіўся ў міфах ён,
Б’ем яму мы свой паклон.
Кажуць, злосная істота,
Людзей гоніць у балота,
Хітра блытае ў соснах…
Леса ён ахоўнік проста.
Дух да шкоднікаў – са злосцю,
Ну а вас ён кліча ў госці.



Прыязджаць вазьміце ў моду
На пушчанскую прыроду!


Адрас: Гродзенская вобласць, Свіслацкі раён, аг.Дабраволя, вул. Міра, 9

Тэлефон: (01513) 7-45-43

infodobrovol@tut.by


ДУА «Дабравольская сярэдняя школа»

# Музей Лесу Запрашае



Тых, хто ў пушчу завітае,
Музей лесу прывітае.
Цікавых экспанатаў
Змяшчае ён багата.
Грыбы, звяры, расліны, дрэвы
У пушчу вам адчыняць дзверы.
Пяць соцен экспанатаў маем.
Вам расказаць пра іх жадаем.

## Жывёлы Чырвонай кнігі



Пачнём з
навінак.
У гэтым годзе
У музейным
карагодзе
Прыбыло лясных братоў,
Чырвонай кнігі жыхароў.
Не пакрыўдзілі прыроду,
Не зрабілі ёй мы шкоду:
Звера каб стварыць выяву,
Пластык мы пусцілі ў справу.
Усё ў натурвелічыню!
Гляньце – хіба ж я маню?
Ёсць на што тут паглядзець –
Зубр гуляе, рысь, мядзведзь.
Гэта вучні працавалі
І звяроў праектавалі.



## Чучалы дзікіх жывёл



Пластык – новае,
а вось
Трыццацігадовы
госць –
Што ні ёсць
сапраўдны дзік,
Сцежкі мерае, не
знік.
Чучала з самога
лесу,
Тут знайшоў сваё
ён месца.





## Чучалы птушак

Ну а ў гэтую хвілінку
Кіньце позірк на
галінкі.
Птушак мноства,
як лістоты,
Пушчы заняло
шыроты.





Птушкі
рэдкія ў нас
Маюць з пластыку анфас
Вось як чорны бусел,
Гонар Беларусі.
Ну а мудрая сава
Прыляцела к нам сама,
Не адрозніш ад жывое –
Маем чучала
такое.

Пра саву казаць – не спаць,
Дзень і ноч апавядаць.
Каб сава за парту
села,
Сто б заўваг яна
займела,
Круціць галавой,
маўляў,
На трыста градусаў
амаль.
Не вылазьце, мышы,
з нор,
Зноў не спіць начны
дазор!

